


# Ахова птушак Бацькаўшчыны

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

BirdLife INTERNATIONAL PARTNER

www.ptushki.org

№ 3 (46) - 2011

# В Беларуси объявлен новый заказник – «Соколиный»




**В Минском районе при участии общественной организации «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) объявлен новый заказник – «Соколиный». Это первый заказник, который создан специально для сохранения древесногнездящейся колонии пустельги обыкновенной.**

Природный комплекс заказника включает особо ценные участки высоковозрастного соснового леса и суходольного луга, в пределах которых находятся места обитания редких животных, а также «краснокнижного» вида растений.

Заказник объявлен решением Минского районного исполнительного комитета на землях Мачулищанского поселкового совета и Минского лесопаркового хозяйства. Площадь заказника составляет 20,9 га. На территории заказника обнаружена осока теневая, которая включена в Красную книгу. Здесь находится самая северная точка произрастания этого редкого растения в Беларуси. В заказнике обитают редкие виды животных: камышовая жаба, коростель, обыкновенная пустельга, зеленый дятел.

Опыт спасения колонии занесенного в Красную книгу РБ сокола и среды его обитания в г.п. Мачулищи Минского района является одним из примеров результативной работы школьников по охране природы родного края. Учащиеся местного клуба «Биоразнообразие» первыми обнаружили колонию соколов. Ситуация складывалась таким образом, что небольшой островной лес мог быть вырублен в результате расширения жилой зоны поселка. Вырубка сосен привела бы к уничтожению среды гнездования сокола и, как следствие, к исчезновению единственной достоверно известной в Беларуси колонии древесногнездящихся пустельг. Воспитанники экологического клуба сумели привлечь внимание общественности к существующей проблеме. Еще в 2006 году старшеклассники предложили создать специальный заказник для пустельги под названием «Соколиный».

Детская идея была поддержана АПБ. В 2007 году реализован проект АПБ «Сохранение пустельги в Минском районе через создание заказника местного значения «Соколиный». Проект выполнялся при финансовой поддержке программы малых грантов некоммерческой корпорации «Isar, Inc» (США). В рамках проекта было разработано в том числе научное и технико-экономическое обоснование объявления заказника «Соколиный». И только в 2011 году территория гнездования пустельги окончательно получила статус биологического заказника местного значения.

Кроме природоохранной значимости, заказник имеет значение как важный объект в системе экологического воспитания и образования подрастающего поколения.

**Руслан Шайкин, специалист по экологическому образованию.**
**Фото автора**

# Есть идея!

Если вы живёте в деревне и работаете в школе, можно попробовать организовать школьное лесничество или маленький заказник возле своей деревни. В д. Вежны Светлогорского района Гомельской области мы уже начали над этим работать.

Основным направлением нашей деятельности будет экологическое образование детей в природе, что будет включать:

а) натуралистическую деятельность (изучение природных систем в их естественном и изменённом состояниях);

б) просветительскую и пропагандистскую деятельность (сбор, анализ, обработка, распространение информации и материалов эколого-просветительского и природоохранного характера);

в) внедрение методов полевого экологического образования в преподавании биологии, географии и экологии, как в средней школе, так и в учреждениях дополнительного образования;

г) природоохранную деятельность (восстановление, защита, сохранение природных экосистем и их компонентов);

д) художественно-эстетическую деятельность (изобразительное, литературное, музыкальное, техническое и др. творчество на материале экологического содержания).

Мы считаем, что нельзя учить биологии, географии и экологии по книжкам и в классных комнатах, детей надо выводить, вывозить и «вытаскивать» в дикую природу, где давать им возможность познакомиться с окружающими растениями и животными, исследовать водоемы, почвы, рельеф, всё «пощупать», «поизучать» и, в конечном счете, – почувствовать Природу.



**Местные жители обследуют территорию будущего заказника**

**Ирина Беляева, руководитель клуба «Крылатый дозор», руководитель ЛЭО «Земляне» (любительское экологическое объединение).**
**Фото автора**



**Пустельга - привычная обитательница г.п. Мачулищи.**

## Выганашчанскія лясы – для птушак і людзей!



Палявы семінар у Івацэвіцкім раёне

Заключным мерапрыемствам праекта «Акцыя для арлоў і людзей. Захаванне рэдкіх відаў Выганашчанскага рэгіёна сіламі грамадскасці», які адбыўся пры падтрымцы праграмы малых грантаў пасольства ЗША, сталі семінары-трэнінгі для работнікаў ДЛГУ «Целяханскі лягсас» і «Ганцавіцкі лягсас».

Вялізны масіў леса, што знаходзіцца ў распараджэнні шэрагу лесагаспадарчых установ, адыгрывае адну з першаступенных роляў у захаванні многіх рэдкіх птушак у Беларусі. А колькасць папуляцыі барадатай кугакаўкі тут адна з самых высокіх у краіне. У межах праекта было выяўлена 16 гнёзд барадатай кугакаўкі і 4 – чорнага бусла. Пашпарты месцаў гнездавання і праекты ахоўных абавязацельстваў рэдкіх відаў былі перададзены ў Івацэвіцкую і Ганцавіцкую інспекцыі аховы прыроды для наступнай перадачы пад ахову.

На семінары-трэнінгу была прадстаўлена дзейнасць АПБ ў галіне захавання лясоў і біяразнастайнасці. Асабліва цікавай для работнікаў лясной і паляўнічай гаспадаркі была інфармацыя пра біятэхнічныя мерапрыемствы для драпежных і рэсурсных відаў птушак.

У «палявой» частцы трэнінга ўдзельнікі навучыліся вызначаць птушак, паспрабавалі апісаць гняздо драпежнай птушкі, даведаліся пра магчымасці выкарыстання сучасных GPS-навігатараў, оптыкі і літаратуры для павышэння эфектыўнасці захавання драпежных птушак. Сяброўская атмасфера, у якой прайшлі трэнінгі, дае магчымасць меркаваць, што лясы і іх насельнікі знаходзяцца пад надзейнай аховай, а атрыманыя веды і інфармацыйныя матэрыялы АПБ будуць запатрабаванымі.

**Вольга Лукшыц, спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях АПБ, каардынатар праекта**
**Фота аўтара**

## Навучыцца і адпачыць

Студэнцкі летнік, прысвечаны асновам кальцавання птушак, прайшоў напрыканцы ліпеня на базе арніталагічнай станцыі ў Тураве. У ім прынялі ўдзел 9 чалавек, сярод іх – студэнты не толькі з Беларусі і Украіны, а таксама 2 аўстрыйскія валанцёркі.

Кальцаванне птушак – адзін з цікавых метадаў у арніталогіі, які дазваляе не толькі атрымаць важныя навуковыя звесткі, але і мае вялікі педагагічны патэнцыял, які варта выкарыстоўваць у падрыхтоўцы студэнтаў-біёлагаў. Таму падчас летніка кальцаванню была прысвечана асноўная ўвага. Каб удзельнікам не даводзілася ўсім разам глядзець на кальцаванне адной птушкі, праца была падзелена на 3 блокі: кальцаванне, назіранне за птушкамі, знаёмства з метадамі вывучэння амфібій.

Такі летнік я праводзіў упершыню, таму ён быў карысны не толькі для студэнтаў, якія прыехалі ў Тураў, але і для мяне асабіста, падцвярджаючы тым самым прынцып: навучаючы, вучышся сам. За тыдзень, праведзены ў Тураве, студэнты ўдзельнічалі ў кальцаванні не толькі кулікоў, але і вялікага арляца ды лебедзя-шыпуна. Летнік завяршыўся сяброўскай вячэрай, дзе кожны атрымаў адмысловае пасведчанне аб удзеле ў летніку. Удзельнікі ўсе як адзін хацелі б сустрэцца ў Тураве яшчэ раз.



Праца з вызначальнікам – важны элемент у навучанні правільна вызначаць від. Фота Дз. Даманцэвіча

**Яўген Сліж**

## Чемпионат, на котором косят




Национальный чемпионат по ручному сенокошению низинных болот «Споровские сенокосы», прошедший в августе, привнес в привычный уклад жителей деревни Здитово Березовского района Брестской области заметное оживление.

АПБ стояло у истоков чемпионата и ежегодно поддерживает его проведение.

Чемпионат «Споровские сенокосы» выявляет лучших в командном и личном зачете. Соревнования служат отборочным турниром, победители которого представят Беларусь 20 августа на международном чемпионате по ручному сенокошению в Польше.

Эта честь выпала сборной «Картузиане», завоевавшей в командном зачете первое место. Второе досталось дуэту косцов из заказника «Выгонощанское», третье – команде заказника «Споровский».

В личном зачете победу одержал «картузианец» Василий Новик, прокосивший свою полосу за 3 минуты 11 секунд. Следом за 3 минуты 15 секунд к финишу пришел его напарник Виктор Зданович.

Замыкал тройку лидеров Илья Ярмолович, представляющий ГПУ «Выгонощанское». Симпатичный рослый парень одолел дистанцию за 3 минуты 30 секунд и, помимо почетного третьего места, завоевал титул самого молодого косца: ему всего лишь 20 лет.

Номинации «За волю к победе» второй год кряду удостаивается сборная АПБ. Уже вне конкурса приз зрительских симпатий достался очаровательной сотруднице АПБ немке-болотоведу Аннет Тиле.

**Елена Садовская, www.wildlife.by**

## Браславские озера могут получить статус территории, важной для птиц



Большой кроншнеп и "маленькие" скворцы. Фото Д.Якубовича

Национальный парк Браславские озера претендует на статус рамсарской территории – водно-болотных угодий международного значения. Кроме того, данная территория может официально стать и территорией, важной для птиц (ТВП).

Многочисленные озера Браславского края привлекают множество различных видов околоводных и водоплавающих птиц, в том числе и редких, занесенных в Красную книгу Республики Беларусь и/или имеющих международный статус охраны. В 2011 году было проведено исследование орнитофауны Браславских озер, выявившее много любопытных фактов. Так, браславские скопы (редкие хищные птицы) освоили опоры линий электропередач в качестве мест для строительства гнезд. До этого гнездо скопы на ЛЭП в Беларуси находили только один раз – в Березинском биосферном заповеднике, а тут сразу три!

Также известно, что здесь обитает как минимум 16 пар большого кроншнепа, и, согласно международным критериям, этого уже достаточно для получения статуса ТВП. Большой кроншнеп относится к видам, близким к глобально угрожаемым. В большинстве стран Европы его численность продолжает сокращаться.

В последние годы в Беларуси отмечаются только отдельные пары либо небольшие колонии большого кроншнепа. Каждая территория, на которой обитает 10 и более пар, представляет большой интерес для ученых. И тем приятнее и символичнее, что территория, важная для гнездования большого кроншнепа, описана именно в 2011 году, так как большой кроншнеп является птицей 2011 года.

**Семён Левый, специалист по природоохранным вопросам, национальный координатор программ ТВП в Беларуси**

## Сколько коростелей обитает на Средней Припяти?

В 2010-2011 годах в заказнике «Средняя Припять» в рамках проекта ПРООН/ГЭФ «Полесье» сотрудниками НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам и членами АПБ проводились учеты нескольких редких видов птиц: большого подорлика, вертлявой камышевки, дупеля и коростеля. В связи с тем, что в 2010 году на реке Припять был очень высокий уровень воды и большая площадь гнездопригодных для коростеля биотопов была затоплена, учеты этого вида были повторены в 2011 году.

Ещё совсем недавно коростель относился к видам, близким к угрожаемым. Вид занесен в 3-е издание Красной книги Республики Беларусь и является одним из ТВП-образующих для Средней Припяти.

Учеты численности коростеля выполнялись на 14 участках общей площадью 40,3 км2. Таким образом, обследованным оказалось 9% от территории заказника «Средняя Припять», пригодной для гнездования вида. Из всей обследованной территории на долю низинных болот и заболоченных лугов пришлось 23,6%, на долю влажных пойменных лугов, сенокосов и пастбищ – 76,4%.

Всего учтено 144 вокализирующих самца коростелей. Плотность гнездования варьировалась от 1,2 до 8,1 особи на км2 (в 2010 году – от 0,04 до 4,33 особи на км2). Минимальные значения плотности отмечены в центральной части заказника, на территории Лунинецкого и Столинского районов; максимальная – в окрестностях д. Кудричи Пинского района и возле д. Вересница Житковичского района.

Таким образом, численность коростеля на территории заказника «Средняя Припять» в 2011 году по нашим расчетам составила 1763 самца. Полученные в текущем году данные позволяют оценить численность этого вида как близкую к максимальной на территории заказника. В целом численность коростеля на ТВП «Средняя Припять» колеблется в пределах 500–1800 пар, в зависимости от степени затопленности гнездовых биотопов вида.



Коростель. Фото Н. Воробья

**Семён Левый, специалист по природоохранным вопросам**

# Новости проекта «Климат и биоразнообразие»

## Завершены работы по восстановлению гидрологического режима болота Долбенишки



Плотина перекрывает картовый канал на Долбенишках.

Восстановление гидрологического режима нарушенного болота Долбенишки Шарковщинского района на Витебской области было начато в 2010 г. и завершилось летом 2011 г. Площадь восстановленной территории – 5501 га. Восстановительные работы были сконцентрированы на участке бывшей торфоразработки. В соответствии со строительным проектом, было построено 30 земляных и комбинированных (земляных и деревянных) перемычек на картовых и магистральном каналах.

В предыдущие годы данная территория регулярно горела, последний крупный торфяной пожар произошел здесь в 2002 году и затронул почти 75% всей территории торфяника.

Болотный массив Долбенишки входит в состав ключевой орнитологической территории «Пойма реки Янки». Ожидается, что меры по восстановлению благотворно скажутся на условиях обитания некоторых из 146 гнездящихся здесь видов птиц (38 отнесены к категориям 1-3 европейского охранного статуса (SPEC)).

Восстановление проектной территории Долбенишки имеет положительный экономический эффект для местного населения, так как заготовка ягод (клюквы, брусники, черники), грибов и лекарственных трав является важной формой хозяйственной деятельности жителей прилегающих населенных пунктов.

**Фото Аннет Тиле**

## Работы по восстановлению нарушенного болота Жада в самом разгаре

Нарушенное болото Жада, расположенное в Миорском и Шарковщинском районах Витебской области – последняя территория, восстановление которой запланировано в рамках проекта «Климат и биоразнообразие».

История осушения болота Жада началась еще в XIX веке, затем в начале 70-х годов XX века в западной части торфяника была построена лесомелиоративная система, значительная часть территории (185 га) была предназначена для добычи торфа фрезерным способом.

Все лето, несмотря на жаркую погоду и обилие комаров, на болоте Жада кипит работа: шумит бензопила, падают спиленные сосны – строители из Миорского ПМС строят плотины. Для восстановления болота необходимо повысить уровень воды примерно до поверхности почвы. Эта цель будет достигнута посредством установления каскадных перемычек с приблизительной разницей уровня воды в 30-40 см. над перемычками. Запланировано строительство более 40 комбинированных перемычек, на данный момент установлено уже более 20. Построенные перемычки перекроют дренирующие каналы и наполнят выработанные участки водой.

Для строительства перемычек используются местные материалы: сосна (которая более долговечна, чем береза), а также торф для наполнения перемычек. Работа физически сложная, ведь только до места строительства необходимо идти по болоту не меньше часа.

Ожидается, что меры по восстановлению улучшат условия для произрастания растений, включенных в Красную книгу Республики Беларусь, будут способствовать улучшению условий обитания 11 видов птиц, включенных в Красную книгу Республики Беларусь, которые встречались на болоте Жада до 2006 г., но не регистрировались или были отмечены лишь в малом количестве после 2006 г. (большой подорлик, черный аист, скопа, малый подорлик, белая куропатка, серый журавль, золотистая ржанка, филин, болотная сова, большой кроншнеп).

### Партнеры проекта




## Пресс-конференция, посвященная вопросам восстановления, сохранения и устойчивого использования деградированных торфяников и нарушенных болот Беларуси

5 июля 2011 года прошла пресс-конференция «Восстановление, сохранение и устойчивое использование деградированных торфяников и нарушенных болот Беларуси: опыт и перспективы».

Целью пресс-конференции стало обсуждение планов Правительства Республики Беларусь и Национальной академии наук Республики Беларусь в области устойчивого использования и восстановления нарушенных торфяников, рассмотрение перспектив использования возобновляемых источников энергии в РБ.




Министр лесного хозяйства РБ Михаил Амельянович и представитель ООН в РБ Антониус Брук



Выступление Норберта Шаффера

В пресс-конференции приняли участие представители ООН/ПРООН в РБ, Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды, Министерства лесного хозяйства, государственного комитета по науке и технологиям, Глобального экологического фонда, концерна Белтопгаз, Национальной академии наук, Королевского общества защиты птиц, ОО «Ахова птушак Бацькаўшчыны», представители национальных СМИ.

Открывая пресс-конференцию, Антониус Брук, представитель ООН/ПРООН в Беларуси, сообщил, что Программа развития ООН и Программа малых грантов Глобального экологического фонда инвестировали в восстановление нарушенных торфяников в Беларуси в общей сложности около 4 млн долларов, что позволило успешно реализовать ряд проектов по повторному заболачиванию нарушенных болот. В своем выступлении Представитель ООН/ПРООН в Беларуси высказался против планов по осушению и добыче торфа на особо охраняемых территориях.

Целесообразность восстановления деградированных торфяников и нарушенных болот для защиты биоразнообразия и смягчения последствий изменения климата подчеркнул Михаил Никифоров, член-корреспондент НАН РБ, генеральный директор ГНПО «Научно-практический центр Национальной академии наук по биоресурсам».

Представитель Королевского общества защиты птиц Норберт Шаффер и директор АПБ Виктор Фенчук выступили на пресс-конференции с совместным докладом на тему «Вклад общественных организаций и местных сообществ в восстановление и сохранение болот».

Пресс-конференция позволила международным донорам и общественным организациям уточнить официальную позицию по вопросу возобновления добычи торфа на ООПТ и рассмотреть перспективы развития проектов в области восстановления болот. Пресс-конференция получила большой резонанс в национальных СМИ (подборку статей по результатам конференции смотрите на сайте проекта «Климат и биоразнообразие» www. restoringpeatlands.org).

**Фото В. Хилькевича**

## Анонс!

### Видеофильм о проекте «Климат и биоразнообразие»

В августе в Беларуси проходили съемки видеофильма о восстановлении торфяников.


На болоте Жада британским фильммейкерам удалось совершить путешествие по уникальным местам. «Такую дикую природу мы видим впервые, это похоже на настоящие джунгли!» – отметил режиссер фильма Том Байли.

Отснятый материал получился очень интересным и разноплановым. В фильм войдут интервью с сотрудниками проекта о восстановлении торфяников, о перспективах углеродного финансирования, восстановительные работы на болоте Жада, национальный колорит чемпионата по сенокошению (одного из способов традиционного использования болот), а также дикая природа, удивительные закаты и рассветы на восстановленных болотах и торфяниках.

Премьера видеофильма состоится на Международной конференции по устойчивому управлению водно-болотными угодьями в трансграничном контексте, которая пройдет в Минске 11–13 октября 2011 г.

**Автор Лидия Пшеницына, информационный помощник проекта**

# Складзена салаўіная карта Мінска




Падведзены вынікі акцыі «Салаўіныя вечары-2011». Акцыя праводзілася пры падтрымцы Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Сёлета ў назіраннях за салаўямі ў Мінску прыняло ўдзел звыш 3 тысяч чалавек, улічана 238 месцаў спявання салаўёў, што амаль на трэць менш, чым у 2010 годзе.

У гэтым годзе пець салаўі ў Мінску сталі на 1,5 тыдня пазней, чым у папярэднія гады. Гэта самы позні час пачатку спявання за апошнія 10 гадоў. Такая ж сітуацыя назіралася і ў цэлым у Еўропе.

Па выніках улікаў АПБ склала Салаўіную карту-2011. На ёй адзначаны месцы спявання салаўёў у 2011 годзе. Сёлета ўпершыню на карце адзначаны некаторыя месцы, дзе салаўі так і не пачалі спяваць, хоць у папярэднія гады птушкі ў гэтых месцах адзначаліся. Салаўіная карта-2011 будзе прапанавана ў якасці падарунка ўсім аматарам прыроды, што паведамяць пра месцы спявання салаўёў. Яе таксама можна паглядзець на сайце АПБ.

АПБ выражае ўдзячнасць усім аматарам прыроды, што паведамілі пра салаўёў. Да сустрэчы на Салаўіных вечарах-2012!

**Руслан Шайкін, спецыяліст па экалагічнай адукацыі**

# Салаўі ў горадзе

У выбары месца для гнездавання салаўі іншы раз досыць неперабарлівыя. Да таго ж, яны валодаюць дастаткова добра выражанымі адаптыўнымі здольнасцямі і досыць пластычныя. Гэта, безумоўна, не азначае, што яны могуць гнездавацца паўсюль. Шэраг патрабаванняў да месца, дзе будзе размяшчацца іх гняздо, салаўі ўсё ж такі прад'яўляюць.

**Увільготненая тэрыторыя.** Салавей селіцца ў месцах, дзе ёсць вадаёмы, у поймах рэк або на іншых сырых і пераўвільготненых месцах. Наяўнасць вадаёма, няхай нават і самага невялікага, або блізкасць ракі найбольш пажадана.

**Кустарнікавыя зарасці.** Густыя зарасці кустарнікаў, куды мала пранікае сонечнае святло і дзе не расце трава – галоўныя кармавыя месцы для салаўя і схоў ад ворагаў. Калі кусты прарэджваць, то пад імі будзе больш святла і будзе расці трава, у якой салаўям складаней знайсці корм.

**Апалае лісце.** Павінны быць месцы, дзе пад кустарнікамі захоўваецца апалае лісце. Уборка лісця прыводзіць да таго, што энтамафаўна, для якой лісцевы покрыў стварае жыццёва неабходныя ўмовы, будзе адсутнічаць, і салаўям будзе складаней знайсці корм. Гнёзды салаўі будуюць таксама з выкарыстаннем лісцевага ападу.

Нягледзячы на тое, што салаўі не пазбягаюць сяліцца паблізу ад жылля чалавека, і да гарадскога шуму досыць цярплівыя, яны аддаюць перавагу спакойнай абстаноўцы.

Такім чынам, пры правядзенні работ па добраўпарадкаванню ў горадзе, для захавання месцаў гнездавання салаўёў асабліва важна падтрымліваць у натуральным стане прырэчныя і паркавыя тэрыторыі, дзе прысутнічае густы кустарнік і захоўваецца апалае лісце. Рэкамендацыі па захаванню салаўіных месцаў у Мінску АПБ перадала ў найбуйнейшае ў рэспубліцы прадпрыемства па азеляненню і добраўпарадкаванню гарадскіх і загарадных тэрыторый УП «Мінскзеленстрой».

**Віталій Яковіч,**
**супрацоўнік РЭЦДзіЮ, сябра АПБ**

# Як беларусы вясну сустракалі




Шосты год запар АПБ каардынавала ў Беларусі агульнаеўрапейскую кампанію «Жывая вясна», у межах якой жыхары еўрапейскага кантынента сачылі за птушкамі-індыкатарамі наступлення вясны.

Першыя тры пазіцыі ў гэтым годзе па колькасці назіранняў і сацыяльнай актыўнасці назіральнікаў займаюць Расія, Італія і Ірландыя. На чацвёртай пазіцыі – Рэспубліка Беларусь. Між іншым, у 2009 годзе па колькасці назіранняў Беларусь была на 6-м месцы, у 2010 годзе – на 5-м месцы. Сёлета ад жыхароў нашай краіны паступіла 4326 паведамленняў. Найбольшая колькасць назіранняў з агромністым адрывам паступіла з Мінскай вобласці, затым ідуць Брэсцкая і Віцебская вобласці. Часцей за ўсё ў Еўропе назіралі за вясковымі ластаўкамі. У Беларусі ж самая вялікая колькасць паведамленняў паступіла аб назіраннях за белымі буслами.

Праект «Жывая вясна» выконваецца пры фінансавай падтрымцы фонда Mitsubishi Corporation для краін Еўропы і Афрыкі (MCFEA). Мэты фонда ўключаюць папулярызацыю экалагічных ведаў і захаванне флоры і фаўны з акцэнтам на рэдкія віды.

**Руслан Шайкін,**
**спецыяліст па экалагічнай адукацыі**

# Еўрапейскія восеньскія дні назіранняў за птушкамі -2011

У 2011 годзе Еўрапейскія восеньскія дні назіранняў за птушкамі праходзяць 1-2 кастрычніка. Для ўдзелу ў акцыі неабходна ў гэтыя дні назіраць за птушкамі, вызначаць віды, падлічваць колькасць птушак і паведамляць гэтыя дадзеныя ў сакратарыят АПБ па тэлефонах: +375 17 263 06 13, +375 17 263 01 30, МТС +375 29 223 06 13, Velcom +375 29 101 68 87, а таксама на e-mail: apb_pr@tut.by

Сярод кіраўнікоў арганізаваных груп (3 і больш чалавек) традыцыйна шляхам латарэі будзе разыграны палявы бінокль. У мінулым годзе ён дастаўся кіраўніку клуба «Крылаты дазор» Новікаўскай СШ Шумілінскага раёна – Івану Анатолевічу Рамановічу.

У межах восеньскіх дзён назіранняў за птушкамі мясцовымі аддзяленнямі АПБ традыцыйна будуць арганізаваны пляцоўкі для назіранняў. Прыняць удзел у арганізацыі пляцовак, а таксама экскурсій па ўліку птушак могуць таксама кіраўнікі клубаў «Крылаты дазор» і актывісты АПБ. Для гэтага можна звярнуцца ў сакратарыят і паведаміць аб неабходнай дапамозе з боку АПБ.

### Месцы і час размяшчэння пляцовак па назіранню за птушкамі ў суботу 1-2 кастрычніка

**1-га кастрычніка**

**Мядзель:** набярэжная возера Мястра, з 10.00 да 14.00

**Віцебск:** Батанічны сад у раёне ракі Віцьба, з 10.00 да 13.00

**Іванава:** Іванавіцкая гімназія, з 9.00 да 16.00

**Слуцк:** 1 пляцоўка – вуліца Набярэжная ў раёне гімназіі №1, з 9.00 да 14.00
2 пляцоўка – Экалагічны цэнтр, з 10.00 да 14.00

**Шуміліна:** раён Шумілінскага возера, з 9.00 да 12.00

**Гродна:** парк Жылібера, з 14.00 да 16.00

Навагрудак: возера Свіцязь, з 10.00 да 12.00

**Сянно:** 1 пляцоўка – аграгарадок «Немойта», з 8.00 да 11.00
2 пляцоўка – г.п. Багушэўск, з 8.00 да 11.00

**Барысаў:** пешаходны мост праз раку Беразіну, з 10.00 да 13.00

**Баранавічы:** бераг Свяцілаўскага возера насупраць вострава кахання, з 9.00 да 12.00

**2-га кастрычніка**

**Мінск:** 1 пляцоўка – Цэнтральны батанічны сад, з 10.00 да 15.00
2 пляцоўка – Мінскі заапарк, з 10.00 да 15.00

### Арганізацыя стацыянарнай пляцоўкі для назіранняў

Пляцоўка для назіранняў – гэта спецыяльна абсталяванае часовае месца, куды можа прыйсці любы ахвочы паназіраць за птушкамі, навучыцца вызначаць самыя звычайныя віды, атрымаць кваліфікаваныя адказы на пытанні пра нашых крылатых суседзяў.

Пры выбары месца для размяшчэння пляцоўкі ўлічваюцца дзве асноўныя ўмовы. Пляцоўка павінна размяшчацца ў месцы канцэнтрацыі птушак. Лепш за ўсё гэтым мэтам адпавядае вадаём: пруд, вадасховішча, возера ці рака, на якой пастаянна трымаюцца вадаплаваючыя птушкі. Пажадана, каб вадаём межаваў з лясным масівам, участкам лесапаркавай зоны або з паркам.

Другая ўмова. Пляцоўка павінна размяшчацца ў месцы, даступным для наведвальнікаў. Паблізу пляцоўкі можа размяшчацца дарога ці сцежка, што выкарыстоўваецца людзьмі як месца прагулкі ў выходныя і святочныя дні.




Дні назіранняў-2010. Зберагіце біяразнастайнасць для нас (г.Лунінец)

На пляцоўцы размяшчаюцца аптычныя прыборы: біноклі, падзорныя трубы. Размяркоўваюцца плакаты з інфармацыяй аб птушках Беларусі. Кожнаму наведвальніку выдаюцца памятныя матэрыялы, напрыклад, кішэнны каляндар.

На пляцоўцы можа быць арганізавана невялікае свята птушак. Традыцыйна праводзіцца конкурс аплікацый з прыродных матэрыялаў. Мэта конкурса: карыстаючыся галінкамі, апалым лісцем, ягадамі, жалудамі і іншым прыродным матэрыялам, які можна сабраць на пляцоўцы, неабходна за непрацяглы час стварыць выяву якіх-небудзь вядомых птушак. Акрамя таго, на пляцоўцы праводзяцца віктарыны, актыўныя гульні з экалагічным зместам.

**Руслан Шайкін, спецыяліст па экалагічнай адукацыі**

# Навіны аддзяленняў

## Акцыя «Марш паркаў-2011» у Барысаве



Быў вывезены цэлы трактарны прычэп смецця.
Фота Г.Земаглядчук

7 чэрвеня 2011 года на тэрыторыі помніка прыроды рэспубліканскага значэння «Старабарысаўскі лес» (Барысаўскі р-н Мінскай вобл.) прайшла акцыя «Марш паркаў», прысвечаная Міжнароднаму дню аховы навакольнага асяроддзя. Арганізатарамі акцыі выступілі ДУА «Барысаўскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва», Барысаўскае раённае аддзяленне АПБ, Барысаўская раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Прыгараднае лясніцтва Барысаўскага лясгаса.

Больш за 70 валанцёраў (вучні, педагогі, прадстаўнікі лясніцтва, грамадскасці, СМІ) сабраліся каля Старабарысаўскай школы, прайшлі 1,5 км да асоба ахоўваемай тэрыторыі пешшу, расклейваючы па дарозе улёткі аб клапатлівым стаўленні да леса. Валанцёры сабралі і вывезлі з тэрыторыі Старабарысаўскага лесу смецце, а праз сродкі масавай інфармацыі звярнуліся да жыхароў Барысаўшчыны з заклікам не пакідаць смецце, не распальваць вогнішчаў, а таксама трымацца правілаў паводзінаў у лесе.

Цікавая гісторыя ўзнікнення помніка прыроды «Старабарысаўскі лес». У 30–40-я гады мінулага стагоддзя ў былым маёнтку князёў Радзівілаў размяшчаўся санаторый СНК СССР. Менавіта для паляпшэння ўмоваў адпачынку і было вырашана перакрыць працякаючы тут мелкі ручай з мэтай стварэння рукатворнага возера. Аднак ручай на самай справе быў толькі знешняй праявай агромністай масы грунтовых вод, падыходзячых да Беразіны. Любая дамба, пры парушэнні структуры ваданосна-га гарызонта, была б немінуча змыта пры вясновай паводцы. Тады інжынеры прынялі іншае рашэнне: дамба была ўзведзена на ўбітых у зямлю сваях, фактычна насыпана зверху. Узровень грунтовых вод падняўся, пры гэтым быў створаны асаблівы гідралагічны рэжым, які дазволіў паспяхова захавацца многім вільгацелюбівым раслінам, у тым ліку і занесеным у Чырвоную кнігу.

**Анжэла Журавель, Барысаўскае раённае аддзяленне АПБ**

## Новый проект в сфере экологического образования

В августе текущего года при финансовой поддержке Программы малых грантов посольства США в Беларуси стартовал новый проект Брестского областного отделения АПБ «Экологическое образование – как механизм сохранения экосистем и видов биосферного резервата «Прибужское Полесье». Проект направлен на повышение эффективности функционирования биосферного резервата «Прибужское Полесье», прежде всего в сфере экологического образования, развитие экотуризма. В рамках проекта запланирована подготовка и публикация туристического путеводителя, рассказывающего о природных и культурных особенностях этой приграничной территории. Чтобы сделать прогулки по экологической тропе «Лесная речка» познавательными и интересными в помощь учителям и сотрудникам ГПУ, для удобства школьников и студентов разрабатывается методический комплекс, а также путеводитель по тропе.

Кроме того, запланировано проведение серии семинаров для учителей школ Бреста, Брестского и Малоритского районов по овладению современными методиками в области экологического образования. В середине октября запланирована презентация туристического путеводителя, а 3-дневный велотур по территории биосферного резервата станет пропагандой активного и познавательного отдыха.

**Андрей Абрамчук, председатель Брестского областного отделения АПБ**

## Мемарыяльная праграма падтрымкі маладых даследчыкаў імя Сяргея Абрамчука

Брэсцкае абласное аддзяленне абвяшчае конкурсны набор заявак па Мемарыяльнай праграме падтрымкі маладых даследчыкаў імя Сяргея Абрамчука (1984-2010).

Для ўдзелу ў конкурсе дастаткова запоўніць адмысловы фармуляр і накіраваць яго на адрас сакратарыята праграмы (apb_brest@mail.ru). Апошні тэрмін падачы заявак – 30 лістапада бягучага года. Вынікі адбору будуць агучаны на чарговай канферэнцыі Брэсцкага абласнога аддзялення.

Мэта праграмы – падтрымка маладых даследчыкаў у галіне арніталогіі ў рэалізацыі іх палявых даследаванняў, стымуляванне да публікавання вынікаў сваіх даследаванняў.

Праграма дае магчымасць забеспячэння элементарных патрэб пры рэалізацыі палявых даследаванняў: пакупка оптыкі і вызначальнікаў, транспартныя выдаткі, харчаванне, але не дае магчымасці заробку праз навуковую дзейнасць.

У праграме можа прыняць удзел кожны! Маладыя даследчыкі – праз удзел у конкурсе і атрыманне сродкаў, а вопытныя навукоўцы ці проста аматары прыроды могуць стаць яе спонсарамі.

Кожны, хто цікавіцца птушкамі і каму не больш за 26 гадоў, можа атрымаць падтрымку ва ўласных даследваннях. Кожны, каму больш за 26 гадоў, можа ахвяраваць сродкі для выкарыстання ў межах праграмы. Наконт ахвяравання сродкаў звяртайцеся на электронны адрас egreta113@mail.ru альбо па тэлефонах: **+375297253216, +375297929924.**

**Андрэй Абрамчук, Брэсцкае абласное аддзяленне АПБ**



Сергей Абрамчук.
Фото К. Войтеховского

## Итоги волонтерских лагерей природоохранного проекта «Спасем Ельню вместе!»-2011



Председатель АПБ Александр Винчевский, специалист по связям с общественностью ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия» Виктор Поздняков и заместитель генерального директора ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия» Андрей Рощупкин ремонтируют плотину на реке Ельнянка

В августе волонтеры АПБ, хранители Ельни и нескольких других Территорий, важных для птиц, объединились, для того, что бы обследовать и отремонтировать плотины, перекрывающие каналы на болоте Ельня. Традиционные лагеря «Спасем Ельню вместе!», финансируемые ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия», совместно с администрацией ГПУ «Ельня» организуются АПБ с 2007 года. В свое время инициатива была поддержана недавно ушедшим из жизни первым директором ГПУ «Ельня» Петром Ивановичем Боголеем, внесшим важный вклад в восстановление болота.

На протяжении четырех лет, более тридцати плотин, перекрывающие каналы, постепенно возвращают Ельню к жизни. Возле ряда плотин скопилось достаточное количество ила, который затягивает каналы и способствует росту сфагнума.

В ходе лагерей были обследованы плотины на каналах, идущих из озер Большое, Бережа, Плоское, Яжгиня, а также реке Ельнянка. Всего было обследована 31 плотина, для более эффективного функционирования 17 плотин было отремонтировано. Особое внимание было привлечено к плотине, построенной на реке Ельнянка, которая участвует в поддержании уровня воды в озерах Черное и Ельно. Она потребовала значительного укрепления и расширения. В работах на Ельнянке активное участие приняли сотрудники ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия». Предприятие уже пятый год играет ключевую роль в масштабном природоохранном проекте «Спасем Ельню вместе!».

**Ольга Лукциц, специалист по природоохранным проектам**
**Фото автора**

## АПБ на Экологическом Форуме в Бресте

27 августа 2011 г. в г. Бресте прошел IX Республиканский экологический форум, посвященный охране лесов. Программа форума включала различные природоохранные акции, фестивали, конференции.



Ректор МГЭУ им. А.Д. Сахарова С.П.Кундас поддерживает восстановление болот.
Фото Л.Пшеницыной

Кроме знакомства с деятельностью АПБ посетители форума смогли проверить свои знания о птицах, приняв участие в викторине. Каждый ответивший на вопрос в качестве приза получал значок с изображением птицы. Также за время форума усилиями посетителей под руководством сотрудника АПБ Дениса Кителя было построено несколько домиков для трясогузки.

На информационном стенде климатического проекта участники форума смогли познакомиться с информацией о территориях, восстановленных в рамках проекта, посмотреть слайд-шоу фотовыставки «Болото. Необычное». На стенде было организовано интерактивное голосование, участникам которого предлагалось проголосовать ЗА восстановление либо ЗА осушение болот. В итоге абсолютное большинство участников – 63 человека отдали свой голос ЗА восстановление и только 1 человек высказался ЗА осушение болот. Все участники голосования сошлись во мнении, что «болота надо защитить всем вместе» и пожелали АПБ дальнейших успехов в восстановлении болот.

Гости стенда дегустировали ароматный «болотный» чай и приняли участие в фотосессии «Почувствуй себя болотоведом».

**Лидия Пшеницына, информационный помощник климатического проекта**
**Тихно Екатерина, специалист по развитию организации**

# Новыя публікацыі АПБ

## «Ведай і захоўвай драпежных птушак Выганашчанскага краю!»





У межах праекта «Акцыя для арлоў і людзей. Захаванне рэдкіх птушак Выганашчанскага рэгіёна сіламі грамадскасці» выдадзены плакат «Ведай і захоўвай драпежных птушак Выганашчанскага краю!» Выданне падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы праграмы малых грантаў пасольства ЗША.

Плакат прызначаны для таго, каб звярнуць увагу насельніцтва рэгіёна на прыгажосць драпежных птушак і іх безабароннасць перад пагрозамі, а спецыялісты могуць выкарыстоўваць яго як сціслы даведнік-вызначальнік драпежных птушак рэгіёна. Плакат распаўсюджваецца ў рэгіёне заказніка «Выганашчанскае», на тэрыторыі трох раёнаў (Івацэвіцкі, Ганцавіцкі, Ляхавіцкі) па ўстановах адукацыі, бібліятэках, арганізацыях БТПР, лягсасах, клубах «Крылаты дазор». Шырокае распаўсюджванне плаката сярод работнікаў дзяржаўнай лясной аховы і адукацыйных устаноў будзе садзейнічаць зніжэнню ўзроўня браканьерства ў рэгіёне.

**Вольга Лукшыц, спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях**

## Пабачыла свет публікацыя «Вяртлявая чаротаўка ў Беларусі. Сучасны стан папуляцыі».




Выданне, прысвечанае вяртлявай чаротаўцы, адкрывае новую серыю публікацый пад агульнай назвай «Прыродаахоўная бібліятэка АПБ». У гэтым выданні прыведзены найбольш актуальныя дадзеныя аб колькасці і размеркаванні вяртлявай чаротаўкі ў Беларусі, аб існуючых пагрозах і мерах па захаванню віда. У дадатку прадстаўлены падрабязны спіс тэрыторый гнездавання вяртлявай чаротаўкі ў нашай краіне.

Публікацыя распаўсюджваецца сярод адміністрацый асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый, інспекцый Мінпрыроды, землекарыстальнікаў тэрыторый гнездавання віда з мэтай іх інфармавання аб сучасным стане папуляцыі вяртлявай чаротаўкі ў Беларусі, аб праблемах і перспектывах захавання гэтага глабальна пагражаемага віда птушак. Выданне было надрукавана ў межах праекта «Міжнароднае супрацоўніцтва па захаванню вяртлявай чаротаўкі: дабрачынная падтрымка RSPB».

**Уладзімір Малашэвіч
міжнародны супрацоўнік
BirdLife International / CMS
па захаванню вяртлявай
чаротаўкі**

## Прымі ўдзел у патруляванні рэк – дапамажы ласосям!

Ласось у Беларусі? Такое пытанне-здзіўленне, напэўна, задалі сабе многія. У адказ варта заўважыць: «Пакуль яшчэ так!»

Гэта не фантазіі, бо гаворка ідзе зусім не аб тым ласосю, які можна купіць у краме. Гаворка аб балтыйскім ласосю – кумжы, які заходзіць на нераст у нашы рэкі. Пра дзівосных рыб-падарожнікаў ведаюць жыхары ў ваколіцах ракі Вілія, бо менавіта па ёй яны падымаюцца для нерасту і разыходзяцца па прытоках. На жаль, дадзены факт не застаўся без увагі з боку браканьераў. Ва ўмовах малой колькасці заходзячай для нераста рыбы нават адзінкавыя выпадкі яе здабычы ставяць пад пагрозу існаванне віда ў Беларусі. Бо чым менш рыб зможа завяршыць нерасту, тым менш іх вернецца ў нашы рэкі праз некалькі гадоў.



**Браканьерскае прыстасаванне для лову ласосяў**

Зніжэнню ўзроўня браканьерства і захаванню кумжы будзе садзейнічаць новы праект АПБ, які ў хуткім часе будзе рэалізаваны: «Захавальнікі жывых рэк: удзел грамадскасці ў захаванні балтыйскага ласося ў Беларусі і Літве».

Вы можаце прыняць удзел у патруляванні рэк. У межах праекта будуць арганізаваны інфармацыйныя сустрэчы з жыхарамі рэгіёна для гутарак аб захаванні ласосяў, маніторынг ласосяў, даследаванне ўчасткаў рэк для ацэнкі наяўных пагроз. Патруляванне будзе праходзіць у лістападзе-снежні. **Калі Вы гатовы прыняць удзел, дашліце загадзя Вашы кантактныя дадзеныя на электронны адрас Lukshyts@ptushki.org (або звярнуўшыся ў офіс АПБ па тэлефонах 017-263-06-13, 029-223-06-13, 029-101-68-87). У лісце неабходна ўказаць прозвішча і імя, кантактныя тэлефоны, адрас, узрост.**

**Вольга Лукшыц, спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях
Фота аўтара**

## Всего лишь один вид определил победителя чемпионата

В субботу 3 сентября прошел открытый чемпионат по спортивной орнитологии. Впервые чемпионат длился 12 часов. 13 команд упорно боролись за звание чемпиона.

Сразу 6 команд преодолели «гроссмейстерский рубеж» в 100 видов. Даже за 12 часов это оказалось сделать очень сложно.

Победителями VIII чемпионата по спортивной орнитологии с результатом 115 видов стала команда «Lintu»: Александр Винчевский (Беларусь), Seppo Hjerppe (Финляндия), Krister Castren — капитан (Финляндия/Литва), Max Vakiala (Финляндия) (на фото слева направо). Это уже третья победа интернациональной команды. Поздравляем победителей!



**Фото А.Винчевского**

Уступив всего на 1 вид, второе место заняла команда «Dreamteam»: Håkan Örtman (Швеция) – капитан, Lennart Carlsson (Швеция), Андрей Храмогин (Беларусь), Дмитрий Винчевский (Беларусь). Команда выступала в окрестностях Гродно.

Третье место заняла команда «Merlin», стартовавшая из г. Турова: Артем Халандач – капитан (Беларусь), Наталья Карлионова (Беларусь), Татьяна Бригинец (Беларусь), Зинаида Горошко (Беларусь).

Пожалуй, больше всех удивила команда «Битва за Волю», которая приняла участие в чемпионате, копая картошку! Таким образом еще не выступал никто! Команда доказала, что птиц можно наблюдать даже и таким оригинальным способом, совмещая, как говорится, приятное с полезным.

Участники чемпионата в сумме за 12 часов увидели 177 видов птиц. Это больше половины от всех видов, когда-либо наблюдавшихся в Беларуси!

Но помимо обычных, часто встречаемых птиц, не обошлось и без редкостей. Среди них – такие как грязовик, малый веретенник, исландский песочник, камнешарка, песчанка, тулес, красный коршун, малая мухоловка, чеграва, круглоносый плавунчик, кобчик, змееяд и другие.

**Поздравляем все команды с отличным выступлением!**

## Птица района – новая инициатива АПБ

Вопросы популяризации и сохранения птиц сегодня приобретают особую значимость в контексте проблем сохранения биологического разнообразия во всем мире. Многие даже самые обычные у нас птицы испытывают проблемы, а их численность сокращается. Одним из путей популяризации и привлечения внимания к пернатым является объявление их символом города или района.

Выбор природных символов добавляет привлекательности населенному пункту или району. Впоследствии объекты природы, ставшие символами, увековечиваются в малых архитектурных формах, наносятся на сувенирную и печатную продукцию. Природные символы прочно закрепляются в истории и культуре населенного пункта.

АПБ реализует идею по объявлению птиц символами городов и районов Беларуси. У нас уже есть примеры выбора и объявления пернатого символа. Например, благодаря инициативе Витебского городского отделения АПБ символом города Витебска выбрана кольчатая горлица. Соответствующий проект по выбору птицы района реализуется Слуцким районным отделением АПБ.

Идея объявления пернатого символа района или города поддержана Министерством природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь и Министерством спорта и туризма.

**Руслан Шайкин,
специалист по экологическому образованию**








АПБ з'яўляецца нацыянальным партнёрам BirdLife International, глабальнай асацыяцыі прыродаахоўных арганізацый

(с) АПБ, 2011 Інфармацыйны бюлетэнь
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны",
Галоўны рэдактар: Фянчук Віктар Аляксандравіч
Рэдакцыйная рада:
Левы Сямён Васільевіч
Лукшыц Вольга Уладзіміраўна
Ціхно Кацярына Валер'еўна
Шайкін Руслан Валянцінавіч
Вёрстка: Гупянец Зміцер

№ 3, 2011 год
Рэгістрацыйны №726
ад 12.10.2009 г.
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Наш адрас:
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны",
вул. Макаёнка, 8-313, 220114,
Мінск Беларусь
Тэл. (017) 263 01 30,
Факс (017) 263 06 13
(029) 223 06 13 МТС
(029) 101 68 87 velcom

E-mail: info@ptushki.org
www.ptushki.org
Для карэспандэнцыі
а/с 306, Мінск, 220050, Беларусь

Дзейнасць ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
падтрымліваецца
Каралеўскім Таварыствам Абароны Птушак (RSPB), партнёрам BirdLife International у Вялікабрытаніі.

Надрукавана ў друкарні
УП "Данарыт".
Ліцэнзія ЛП № 02330/0494183 ад 03.04.2009.
Наклад 1000 паас.
Перадрук дазваляецца пры ўмове спасылкі на "Інфармацыйны бюлетэнь"
Замова № 2050